Таму цяпер і ў Лукашэнкі ёсьць яшчэ больш прычынаў, каб казаць аб незалежнасьці і забыцца на любыя інтэграцыйныя працэсы. Як сьведчыць Станіслаў Багданкевіч, такія тэндэнцыі таксама характэрныя для стратэгіі прэзыдэнцкай каманды апошнім часам.

У гэтым выпадку можна казаць, што камандзе Лукашэнкі прыходзіцца балянсаваць на лязе нажа, спрабуючы захаваць статус-кво. Ім трэба аднačасова клапаціцца і пра сяброўства, і пра ўтрыманьне пад кантролем расейскага ўплыву на тэрыторыі Беларусі. Інакш пытаньне зьмены ўлады будзе вырашана імгненна. Нядзіўна, што на стратэгічным узроўні кіраўніцтва краіны пачало вельмі асьцярожна ставіцца да ўласнай незалежнасьці.

Шмат што будзе залежыць і ад таго, ці пераканае ўрэшце рэшт Лукашэнка Пуціна ў тым, што альтэрнатывы яму няма. Зрабіць гэта будзе цяжка, тым больш, што для старога ваўка разьведкі пытаньне выглядае не складаней за трывіяльную зьмену рэзыдэнтуры. А на чале рэзыдэнтуры мусіць стаяць чалавек з халоднай галавой і цьвярозым розумам. У гэтых раскладах публічная агалоска псыхіятрычнага заключэньня – яшчэ адзін вельмі непрыемны для Лукашэнкі фактар.

Але перахітрыць Пуціна і ўсіх астатніх гіпатэтычна можна. Магчыма, якраз з разьлікам на гэта і была зробленая студзеньская заява міністэрства юстыцыі. Пад шыльдай замацаваньня ў канстытуцыі інтэграцыйных памкненьняў і непарушнасьці саюзных дамоваў Лукашэнка можа дамагчыся правядзеньня новага рэфэрэндуму па канстытуцыі. Далейшы шлях просты й зразумелы: аднačасова ў канстытуцыю будзе ўнесенае палажэньне аб выбарах прэзыдэнта праз Нацыянальны сход.

Пры гэтым раскладзе прэзыдэнт прыгожа нейтралізуе любы ўплыў на зыход выбараў і праблема крамлёўскай падтрымкі на нейкі час будзе вырашана. Застанецца толькі разабрацца з народам. Але тут разьлік будзе зроблены на памяркоўнасьць, армію і ўласны папулізм.

З ДРУГОГА БЕРАГУ

«ОТПОР!»: ДОСЬВЕД ПЕРАМОГІ

Напрыканцы студзеня ў Менску гасьцявалі Мілаш Міленкавіч і Слабадан Джынавіч, сябры сэрбскага маладзёвага руху «ОТПОР!» («Супраціў!»), на чым сумленьні зьвяржэньне рэжыму Мілошавіча.



У Менску сэрбы бралі ўдзел у міжнародным калёквіюме «Самаарганізацыя грамадзянскай супольнасьці ў пераходны пэрыяд». Пасьля калёквіюму Слабадан і Мілаш знайшлі час, каб сустрэцца з карэспандэнтам «Згоды» і адказаць на яго пытаньні.

– Упершыню мы пачулі пра сэрбскі дэмакратычны рух падчас беспрэцэдэнтнай трохмесячнай кампаніі вулічных пратэстаў у 1996-97. Тады вельмі актыўна сябе праявіла арганізацыя бялградзкіх студэнтаў «Студэнцкі протэст». Ці мае «ОТПОР!» нейкае дачыненьне да гэтага руху?

С. Дж.: Я сам быў актывістам студэнцкага руху ў той час. У 1996-97 мы мелі супольныя дэманстрацыі грамадзянаў і студэнтаў. Але пасьля таго, як Мілошавіч прызнаў вынікі муніцыпальных выбараў, партыі прыпынілі свае пратэсты, а студэнты працягвалі праводзіць дэманстрацыі адны. У нас былі яшчэ патрабаваньні: зняцьцё з пасады рэктара Бялградзкага ўнівэрсытэту й міністра адукацыі. І пасля 120-дзённага марафону вулічных акцыяў яны выканалі ўсе нашыя патрабаваньні. Але сытуацыя істотна не зьмянілася: адных людзей зьнялі з пасад і прызначылі на іх месца іншых, але такіх жа самых.

Пасьля гэтага многія актывісты пакінулі шэрагі студэнцкага руху, далучыліся да палітычных партыяў. Увогуле ж, грамадзтва апанавала апатыя. «*ОТПОР!*» паўстаў пазьней пры іншых абставінах. Але з дзьвюх заснавальнікаў «*ОТПОРу!*» палову склалі менавіта актывісты «*Студэнцкага протэсту*».

– Я ведаю, што «ОТПОР!» нарадзіўся падчас акупацыйнага страйку на трох факультэтах Бялградзкага ўнівэрсытэту. Не маглі б вы падрабязней пра гэта распавесьці?

С. Дж.: У кастрычніку 1998 году наш урад выдаў новы закон «Аб унівэрсытэце». Паводле яго ўсе прафэсары мусілі падпісаць пагадненьне з урадам пад пагрозай звальненьня, усе рэктары й дэканы прызначаліся непасрэдна міністэрствам адукацыі, нават званьне прафэсара павінна было зацьвярджацца ў міністэрстве. Усе студэнцкія арганізацыі выганяліся з унівэрсытэту, ім было забаронена працаваць. Аднačасова ўлады ў пяць разоў паднялі плату за навучаньне й да таго ж увялі дадатковую катэгорыю студэнтаў – яны плацілі шалёныя грошы, каля 10 тысячаў даляраў, і без усялякіх іспытаў і залікаў атрымлівалі дыплём. Усё гэта супала з увядзеньнем яшчэ аднаго закону – «Аб СМІ».

Паводле гэтага закону любую газэту можна было зачыніць, калі яна крытыкавала ўлады. Мэханізм быў вельмі просты: на газэту падавалі ў суд, і ён напрацягу аднаго дня выносіў рашэньне аб спагнаньні з рэдакцыі штрафу, скажам, у 40-50 тысячаў даляраў. Таму, калі былі зачынены асноўныя незалежныя бялградзкія СМІ, калі прафэсароў пачалі прымушаць падпісваць з урадам пагадненьне, мы акупавалі тры факультэты ўнівэрсытэту й распачалі страйк.

– Ці былі рэпрэсіі, каб задушыць ваш рух у самым пачатку, пакуль «ОТПОР!» яшчэ ня стаў моцным?

С. Дж.: Улады спачатку вырашылі, што мы слабыя й ня будзем здольныя эфэктыўна ім супрацьстаяць. Таму яны ня сталі нас душыць. Яны памыліліся. Праўда, праз два тыдні траіх нашых сяброў выгналі з унівэрсытэту. Але мы арганізавалі моцную кампанію падтрымкі, і праз месяц іх аднавілі.

М. М.: Падставай для першага арышту нашых актывістаў у лістападзе 1998 стала тое, што яны спрэем малявалі наш сымбаль – сьціснуты кулак – пасьля гэтага арышты сталі рэгулярнымі. Напрыклад, у 2000 годзе да перамогі Каштуніцы на выбарах 23 верасьня больш за 2000 нашых актывістаў было арыштавана. Разам яны адседзелі ў турме 48 тысяч гадзінаў. Некаторых арыштоўвалі пяць, а то й шэсьць разоў.

– Мілаш, цябе выгналі зь факультэту, нягледзячы на тое, што ты быў адным з лепшых студэнтаў. Цябе потым аднавілі?

М. М.: Гэта вельмі цікава. Дэкан майго факультэту меў пры сабе целаахоўнікаў. Падчас шэрагу акцыяў, якія «*ОТПОР!*» праводзіў, мой твар стаў ім знаёмы. Таму целаахоўнікі мяне зьбілі й перасталі пускаць на факультэт. Зараз я маю надзею аднавіць маё навучаньне.

– Што вы адчулі, калі выйгралі выбары, калі ў Бялградзе перамагла рэвалюцыя й рэжым паў?

М. М.: Спачатку я распавяду пра пачуцьцё, якое я перажыў 5 кастрычніка падчас рэвалюцыі. Мая задача была прывесьці калёну студэнтаў на плошчу перад будынкам парляманту. Калі мы прыйшлі й убачылі людзей, якія там сабраліся з усёй краіны, з усіх рэгіёнаў Сэрбіі, я упершыню ў жыцьці адчуў моцны ўздым, які апанаваў усіх. Было бачна, што ўсе рашуча настроеныя на тое, каб нарэшце скончыць усё цяпер. Нават у паветры лунала, што гэтыя людзі не паедуць дахаты, калі ня вырашаць галоўную праблему, дзеля якой яны сабраліся.

Два гады таму ўсе яны былі разгубленыя, апатычныя, яны не верылі ў магчымасьць пераменаў. Але там, на плошчы, мы ведалі, што пераможам. Праз дванаццаць гадзін усё было завершана – мы перамаглі. Але спатрэбілася яшчэ некалькі тыдняў, каб канчаткова прыйшло асэнсаваньне маштабнасьці гэтай падзеі.

– Што будзе зараз? Праграма «ОТПОРу!» ёсьць праграмай нэгатыўнай. Вы змагаліся супраць. Зараз у вас дэмакратычны прэзыдэнт і ўрад. Ці азначае гэта, што канцэпцыя «ОТПОРу!» сябе вычарпала, што на яго месцы мусяць паўстаць іншыя арганізацыі?

М. М.: Калі мы толькі заснавалі «*ОТПОР!*», мы адразу сказалі, што нашай задачай ёсьць ня столькі зьвергнуць рэжым Мілошавіча, але стварыць нармальную дэмакратычную краіну, грамадзянскую супольнасьць. Карацей, такія ўмовы, пры якіх немагчыма паўтарэньне таго, што мы перажылі. Таму сваім актывістам мы казалі, што «*ОТПОР!*» – гэта праца для цэлага пакаленьня. Нам трэба хаця б дзесяць гадоў, каб зьмяніць не рэжым, а ўсю сыстэму. Дзесяць гадоў ад моманту адлучэньня Мілошавіча ад улады да моманту атрыманьня першых станоўчых вынікаў.

Сапраўдная праца толькі пачынаецца, яна наперадзе. Мы, канешне, зрабілі рэарганізацыю нашага руху. Зараз мы маем чатыры сэкцыі. Першая праца ва ўнівэрсытэтах. Яе задачай ёсьць стварэньне сучаснай сыстэмы адукацыі, якая калісьці была адметнасьцю Бялградзкага ўнівэрсытэту, калі, напрыклад, мэдычны факультэт і радыёэлектронны былі аднымі з самых перадавых у Эўропе.

Зараз трэба зноўку аднаўляць кантакты, студэнцкія й выкладчыцкія абмены й г. д. Другая сэкцыя будзе працаваць з моладзьдзю праз сетку моладзевых клюбаў. Будзем імкнуцца стварыць зь Бялграду эўрапейскі культурны цэнтар, якім ён калісьці быў. Таксама трэба ўсталёўваць кантакты з той моладзьдзю, якая эміграваў. Магчыма, хтосьці зь іх пажадае вярнуцца, але й тыя, хто застанецца за мяжой, могуць дапамагаць Сэрбіі. Трэцяя сэкцыя зоймецца экалягічнымі праблемамі. У лютым мы запускаем новы праект – «Зялёны кулак», які будзе працаваць у гэтым напрамку. І, нарэшце, чацьвёртая сэкцыя будзе займацца ўсталяваньнем і абаронай элемэнтаў свабоднага грамадзтва. Напрыклад, у галіне свабоды друку амаль нічога не зьмянілася.

Сытуацыя проста павярнулася на 180 градусаў. Раней СМІ адлюстроўвалі адну пазыцыю, а зараз таксама адну, толькі гэта ўжо пазыцыя новага дэмакратычнага ўраду. Мы не для таго зьвяргалі Мілошавіча, каб на яго месца прыйшоў другі Мілошавіч. Таму зараз мы праводзім кампанію «Мы назіраем за вамі», мэтай якой ёсьць сачыць за тым, як партыі былой апазыцыі выконваюць свае перадвыбарчыя абяцаньні, каб яны не патанулі ў балоце карупцыі.

– Ці ёсьць зараз пэўныя разыходжаньні паміж вамі й урадам Зорана Джынджыча? Я ведаю, што вы выступаеце за тое, каб дапусьціць у Югаславію Гаагскі трыбунал, каб судзіць у Гаазе Мілошавіча, а прэзыдэнт Каштуніца супраць гэтага.

С. Дж.: Калісьці яшчэ перад выбарамі Каштуніца выступаў па сэрбскаму радыё і казаў: «*Што гэта за «ОТПОР!»? Хто ім плоціць грошы? Я ўвогуле не разумею, чаму паліцыя дагэтуль ня можа арыштаваць актывістаў гэтай незарэгістраванай арганізацыі*». Таму, калі мы раптоўна за два месяцы да выбараў зразумелі, што хутчэй за ўсё менавіта Каштуніца стане адзіным кандыдатам у прэзыдэнты ад апазыцыі, гэта быў для нас шок. Але мы яго перажылі й пачалі працаваць супольна з астатнімі дэмакратамі.

М. М.: Заўсёды будуць пэўныя пазыцыі, зь якімі мы ня можам пагадзіцца. Але пакуль асноўны кірунак урада супадае з нашымі мэтамі. Што будзе далей – пабачым.



АНАЛІЗЫ

БЕЛАРУСЬ, УКРАІНА, ПОЛЬШЧА: УМОВЫ ІСНАВАНЬНЯ

Тацьцяна ПАПОВА

31 студзеня ў Менску прадстаўнікі беларускіх, польскіх ды ўкраінскіх прадпрымальніцкіх колаў распачлі абмеркаваньне «Досьведу й пэрспэктыў умацаваньня эканамічнага й трансмежнага супрацоўніцтва».

Сустрэчу пад такім назовам зьладзіў ЦПП «Цэнтар XXI стагодзьдзе» пры ўдзеле беларускага МЗС ды гандлёва-эканамічнага адзьдзелу польскае амбасады.

Умовы існаваньня прадпрымальніцтва ў Беларусі, Польшчы й Украіне розьняцца, бо розьняцца й стратэгіі эканамічнага разьвіцьця гэтых краін. Рынкавыя прынцыпы ў Польшчы, якая перакраіла сваю эканамічную сыстэму яшчэ дзесяць гадоў таму, даюць значна лепшыя вынікі, чым адміністратыўна кіруемая беларуская ці алігархічная ўкраінская мадэлі.

Малы й сярэдні бізнэс

Польская эканоміка фактычна трымаецца на малых і сярэдніх прадпрыемствах. Два з паловай мільёны зарэгістраваных суб'ектаў гаспадараньня сталіся фактарам, які не дае ўзмацніцца тэндэнцыі росту беспрацоўных. Прыватызацыйная рэформа й адносная непатрабавальнасьць заканадаўства абумовілі посьпех легальных прадпрымальнікаў. Таму панятак ценевага бізнэсу ў Польшчы ніцуецца з крыміналам.

Афіцыйныя паказальнікі разьвіцьця малога й сярэдняга бізнэсу на Ўкраіне мізэрныя. Колькасьць суб'ектаў гаспадараньня там не перавышае дзесятае часткі польскага прадпрымальніцкага саслоўя. Народ аддае перавагу дзейнасьці без належнае рэгістрацыі. Таму грашовы зварот у ценевым (некантралюемым дзяржавай) сэктары ўкраінскае эканомікі вельмі значны. Аналітыкі аўтарытэтнага на Ўкраіне Інстытуту трансфармацыімі грамадзтва (ІТГ) упэўненыя, што рэфармаваньне сыстэмы падаткаабкладаньня, замацаванае ў новым падатковым кодэксе, можа прывесьці да канчатковага заняпаду малога й сярэдняга бізнэсу.

Прадпрымальніцкая заможнасьць ператварылася ў міт і ва ўмовах беларускае рэчаіснасьці. Толькі для 3-х адсоткаў семьяў у рэспубліцы прыбытак ад прыватнага бізнэсу ёсьць асноўны крыніцай даходаў.

Адным з фактараў, што касуе жаданьне беларускіх грамадзянаў самастойна зарабляць грошы, сталася нясьпешнасьць і неарганізаванасьць прыватызацыі. Прыватнымі суб'ектамі гаспадараньня зьяўляюцца ня больш як траціна крамаў ды кафэшак-рэстаранчыкаў. У сельскай гаспадарцы прыватызавана толькі сёмая частка прадпрыемстваў, у іншых галінах паказальнікі што каціныя сьлёзы. Між тым, вытворчасьць ініцыятыўных сялян па аб'ёмах наступае на пяткі ўсім разам узятым калгасам ды саўгасам. Бюджэтныя субсыдыі дапамагаюць дзяржаўным утварэньням як прыпаркі нябожчыку.

Прыватныя вытворцы ды гандляры на палёгкі й дапамогу не разьлічваюць, выплочваючы велізарныя падаткі. З-за іх надзвычайных памераў, а таксама з-за самадурства заканатворцаў ды аўтара неаспрэчных дэкрэтаў, прыблізна паўмільёна грамадзянаў працуюць бяз простага дзяржаўнага кіраваньня – фактычна нелегальна. Ценевы сэктар у беларускай эканоміцы складае, па ацэнках адмыслоўцаў, 25% ад ВВП па макраэканамічных паказальніках.

Падаткаабкладаньне

У 2001 годзе ва ўкраінскай сыстэме падаткаабкладаньня захоўваюцца некалькі дзесяткаў абавязковых плацяжоў, якія робяць яе неэфэктыўнай і да злачынства дарагой. Карна-рэпрэсыўны характар актыўнасьці падатковых інспэктараў, якія кіруюцца, пэўне, прынцыпамі Мэрфі, толькі ўскладняюць сытуацыю. Асноўны падатковы цяжар цяпер нясуць эфэктыўна працуючыя прадпрыемствы, якіх штодня застаецца ўсё меней. Затое расьце колькасьць стратных прадпрыемстваў, свабодных ад выплат у бюджэт эканамічных зон, кампаній, што маюць значныя падатковыя палёгкі. Ва ўмовах касаваньня ды рэструктурызацыі падатковых запазычанасьцяў цэлых сэктараў эканомікі, іх стабільны рост немагчымы.

Беларуская сытуацыя вельмі нагадвае ўкраінскі варыянт. Няпэўныя крокі рэфармаваньня падатковае сыстэмы пакуль не далі плёну. Яе груваскасьць і дарагавізна садзейнічаюць зноў-такі разьвіцьцю ценевае эканомікі. Складана пераацаніць уплыў падатковага цяжару на рост стратных прадпрыемстваў. Амаль чвэрць (23,5%) ад іх агульнае колькасьці трацяць дзяржаўныя грошы, не пакрываючы сваіх выдаткаў.

Бюджэтная сфэра

«Аб'ектыўных падставаў для невыкананьня дзяржаўнага бюджэту Ўкраіны ў 2001 годзе няма,» – упэўнены доктар эканомікі з ІТГ Алег Соскін. Нэгатыўным фактарам можа стацца адзінае сыстэмны палітычны крызыс, што прывядзе да кадравых зьменаў (адстаўка кабінэту міністраў, прэзыдэнта ці роспуск Вярхоўнае рады). Калі ж нічога такога ня здарыцца, дык і бюджэт будзе пасьпяхова выкананы. Але пасьпяховасьць выкананьня ня значыць паляпшэньня роўню жыцьця насельнікаў. Даходы ўкраінскіх жыхароў, як і беларускіх, плянуюць павялічыць, але рабіць гэта будуць ва ўмовах і за кошт недафінансаваньня астатніх бюджэтных выдаткаў.



Якасныя характарыстыкі структуры эканомікі могуць пагоршыцца з-за значнай цэнтралізацыі паступленьняў, прыхаванага дэфіцыту й павелічэньня падатковага ціску, закладзеных у бюджэт 2001 году. Аналітыкі не выключаюць павелічэньня колькасьці стратных прадпрыемстваў і зьмяншэньня агульнае сумы зьбіраемых падаткаў.

Беларускі бюджэт, нагадаем, прымалі ў сьпешцы перад парлямэнцкімі выбарамі. Толькі з пачаткам фінансавага году высьветлілася, што зь яго выкананьнем могуць узнікнуць некаторыя праблемы. Перадусім, скарачэньне выдаткаў для сельскае гаспадаркі, якая толькі пачала рыхтавацца да свайго рэфармаваньня, не дазволіць выканаць патрабаваньні урада па зборы ўраджаю-2001. Востра неабходныя зьмены ў падатковым заканадаўстве адаптаваць да бюджэту не ўяўляецца магчымым. Пакуль зьбіраемых з насельніцтва й прадпрыемстваў грошай нават тэарытычна не хапае на стодаляравыя заробкі. Таму ня выключана, што асобныя артыкулы галоўнага фінансавага дакумэнту краіны давядзецца перагледзець, карэктуючы памеры выдаткаў у адпаведнасьці з рэальнай інфляцыяй.



Інфляцыя

У сьнежні мінулага году польскія злотыя праявілі рэкордную трываласьць. Узровень інфляцыі складаў усяго 0,2%. Гэты паказальнік быў абумоўлены пераважна коштавымі зьменамі: нязначным ростам цэнаў на прадукты харчаваньня й паслугі, паніжэньнем коштаў на спажывецкія тавары. Адылі, Польшчу не абмінула зімовае супакаеньне на эўрапейскіх палiўных рынках, дазволіўшы сярэднегадавой інфляцыі скараціцца зь 9,8 да 8,5%.

Мінулагоднія прагнозы 16–18-адсоткавае інфляцыі ўкраінскае грыўны ня спраўдзіліся. Рэальныя афіцыйныя паказальнікі дасягнулі 28,5%. У бюджэт на 2001 год закладзены паказальнік у 13,6%. Аналітыкі ІТГ лічаць, што ўкраінскі ўрад, неадэкватна ацэньваючы сваю моц, зноў займаецца самападманам. Нельга скідваць з рахункаў хаця б той факт, што нафту й газ Украіна набывае па сусьветных коштах, бо Расія, зьяўляючыся асноўным пастаўнікам энэргетычных рэсурсаў у гэтую краіну, карыстаецца з сусьветных тэндэнцыяў павышэньня коштаў на энэрганосьбіты.

Між тым, па інфармацыі ІТГ, Нацыянальны банк Украіны мае дастаткова сродкаў для ўтрыманьня стабільнага курсу грыўны. У мінулым годзе НБУ здолеў узбуйніць свае золатавалютныя запасы дзякуючы станоўчаму сальда гандлёвага балянсу. І гэта нягледзячы на неабходнасьць выплочваць працэнты па зьнешніх запазычанасьцях. Аналітыкі чакаюць захаваньня гэтае тэндэнцыі ў наступным годзе.

Яны прадказваюць інфляцыю на ўзроўні 30–35%, калі структурных пераўтварэньняў у эканоміцы ня будзе. Такі прагноз адумоўлены наступствамі максымальнага скарачэньня запазычанасьцяў па сацыяльных выплатах, задэкляраванага кабінэтам міністраў Украіны, ды верагоднымі імпартам зерня ў лютым-сакавіку (ураджай, нарыхтаваны ў мінулым годзе, быў недастатковым).

Мінулагодні інфляцыйны рост у Беларусі стаўся самым імклівым на прасторы СНД. У новы год Беларусь ўвайшла з 83-адсоткавай розьніцай ў індэксах спажывецкіх і вытворчых аптовых коштаў, павялічыўшы такім чынам інфляцыйны патэнцыял.

Ва ўмовах заплянаванага штомесячнага росту грашовае масы на 3,5%, апошняй гранатай чыноўніцтва ў барацьбе зь інфляцыяй засталася пастанова *«Аб праграме антыінфляцыйных мер на 2001 год»*. У ёй месьцяцца стратэгічныя пляны па продажу дзяржаўных каштоўных папер нерэзыдэнтам (перадусім расійскім банкам), па рэфармаваньню сыстэмы рэгуляваньня выдаткаў на вытворчасьць й рэалізацыю тавараў і па ажыцьцяўленьню мары павялічыць экспартны патэнцыял беларускае прадукцыі. Тым часам, дадатковым фактарам спрыяньня ненажэрнай інфляцыі станецца расійскі крэдыт, які павінен трымаць курс разьліковага білету Нацбанку ў межах дазволеных 1612-ёх адзінак за амэрыканскі даляр.

Стодаляравыя заробкі, такім чынам, маленечкімі крокамі набліжаюцца да рэчаіснасьці. Але на дабрабыт насельнікаў гэта не паўплывае. Стаўкі заработнае платы мусяць быць узьнятыя на 11% для захаваньня хаця б сьнежаньскага ўзроўню пакупніцкае здольнасьці.

Інвэстыцыі

Ад стабільнасьці нацыянальных валют непасрэдна залежыць інвэстыцыйная прывабнасьць краін. Польшча, маючы дачыненьне да агульнаэўрапейскае эканамічнае інтэграцыі, ствярае ўмовы для прыцягненьня замежнага капіталу. Незалежныя адмыслоўцы ўважаюць яе крэдытны рэйтынг вышэйшым за сярэдні. Таму буйнейшая француская цукровая кампанія заявіла аб сваім жаданьні супрацоўнічаць з польскімі партнэрамі. Польскае прадстаўніцтва амэрыканскага *Citybank* мае намер злучыцца з Гандлёвым банкам, у выніку чаго ўтворыцца трэці па велічыні й значнасьці камэрцыйны банк ў Польшчы. Вытворцы аўтамабіляў таксама з задавальненьнем адчыняюць свае філіі на польскай зямлі.


Спрыяльнымі для інвэстараў акалічнасьцямі зьяўляюцца асаблівасьці функцыянаваньня ў Польшчы адмысловых эканамічных зон. Іх роля настолькі вялікая, што на спробу ўраду адмяніць ільготны падатак на нерухомасьць ў СЭЗ тамтэйшыя суб'екты гаспадараньня, большасьць зь якіх мае замежны капітал ва ўстаўных фондах, адказалі зваротам у суд.

Прытоку замежных інвэстыцыяў на Ўкраіну садзейнічае захаваная зьнешнеэканамічная каньюнктура. Значнай падтрымкай апынулася й адноўленае МВФ крэдытаваньне. Першы транш у памеры 245 мільёнаў *USD* Украіна атрымала пры канцы мінулага году.

Калі МВФ рызыкне дапамагаць беларусам, невядома. Сама ствараць спрыяльныя ўмовы для чыннасьці інвэстараў Беларусь таксама ня здольная. Таму сусьветнавядомыя кампаніі, якія спадзяваліся, што з набыцьцём незалежнасьці Беларусь дазволіць дзесяці мільёнам патэнцыйных спажыўцоў ды партнэраў адчуць перавагі рынкавае эканомікі, усё часьцей вешаюць на дзьвярох сваіх офісаў шыльдачкі *«CLOSED»*.

Беларусь можа ганарыцца тым, што неўзабаве падпіша пагадненьне аб узаемнай абароне інвэстыцыяў зь Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікай. Экзатычны вэктар пакуль не вызначаецца пэрспэктыўнасьцю: тавараразварот паміж краінамі ў мінулым годзе не дацягнуў нават да 2 мільёнаў *USD*. Афрыканскія інвэстары не зьбіраюцца давяраць свае грошы беларускаму рынку. Гутарка вядзецца аб стварэньні ў ПАР зборачнае вытворчасьці беларускіх трактараў. ■

НАВІНЫ



ТАРЫФЫ. Зносіны беларускіх насельнікаў праз факс ці тэлеграф сталі даражэй. Аматарам доўгіх тэлефонных гутарак фінансавы фактар таксама нагадаў пра сябе. З 25 студзеня тарыфы для суразмоўцаў у межах аднога гораду ці вёскі павялічыліся на 8 адсоткаў. Даведка аб справах бабулі, што жыве ў іншым населеным пункце, апынецца на 11 адсоткаў даражэй, чым раней. 120-хвілінная магнітная картка для гарадзкіх тэлефанаваньняў палегчыць кішэню на 1010 *BYB*.

УРАДЖАЙ. На адным з апошніх паседжаньняў урад вызначыў плян ураджаю для беларускіх калгасьнікаў. Тыя, хто захоча мець дзяржаўныя ўзнагароды за працу на палёх краіны, павінны будуць сабраць больш як 5,9 мільёнаў тон зерня й ня менш як 7,5 мільёнаў тонаў бульбы ў дадатак да 1,5 мільёнаў тон цукровых буракоў.

ПЭНСЫІ. Зь 1-га лютага бабулькі й дзядулькі ў чэргах за пэнсыямі будуць абмяркоўваць новае павышэньне заслужаных грашовых выплатаў. Цяпер кожны зь іх можна разьлічваць ня менш як на 23 293 *BYB*. Максымальная пэнсыя для тых, хто не працуе, наблізіцца да 68-ёх тысячаў *BYB*. Фонд сацыяльнае абароны павялічыць свае выдаткі адносна студзеня да 108 237 мільярдаў разьліковых білетаў. Новыя памеры пэнсыяў налічваюцца з улікам росту сярэдняе заработнае платы ў сьнежні мінулага году й бюджэту спажывецкага мінімуму. Але жыць па сьнежаньскіх нормах давядзецца ў лютым.




КОШТЫ. Канцэрн «Белнафтахім», наадварот, абвясьціў аб памяншэньні коштаў на свае вырабы. Дагэтуль нафтапрадукцыя ў Беларусі толькі даражэла. Рашэньне гандляваць таньнейшым на 5 адсоткаў бэнзынам ды на дзесятую долю – дызпалівам было прынятае пасьля таго, як панізіліся кошты на расійскую нафту. Кіраўніцтва канцэрну прыдумала ўзьняць канкурэнтназдольнасьць сваёй прадукцыі.

БАНКІ. 30 студзеня Нацыянальны банк паведаміў аб пазбаўленьні банку «БелБалтыя» агульнае ліцэнзыі на ажыцьцяўленьне банкаўскіх апэрацыяў ды генэральнае ліцэнзыі, неабходнае для легальных апэрацыяў з валютай.

Між тым, кіраваньне Нацбанку прыняло рашэньне аб ЗАО «Атамбанк». Ён ствараецца на правох рэзыдэнта свабоднае эканамічнае зоны «Менск». Устаўны фонд банку складзе 500 тысяч *USD*, што адпавядае правілам стварэньня й рэгуляваньня дзейнасьці банкаў на тэрыторыі СЭЗ ў РБ.

ПАДАТКІ. У мінулым годзе плён супрацоўнікаў менскае падатковае інспэкцыі ўвасобіўся ў 793 мільярды *BYB* сабраных сродкаў. Асноўнымі трымальнікамі 18-мільярдавае запазычанасьці апынуліся прадпрыемствы дзяржсэктару. Такія, як МАЗ ды маторны завод. *«Па выніках рэгулярных падатковых праверак яны ж зьяўляюцца найбольш частымі парушальнікамі заканадаўства,»* – паскардзіўся начальнік сталічных падатковых органаў Максім Канюшка.



МВФ. Беларускія эканамісты не губляюць надзеі атрымаць крэдыт stand-by ад Міжнароднага валютнага фонду. Чарговая місыя МВФ будзе гасьцяваць ў нашай краіне з 13 лютага. На працягу цэлага тыдню замежныя фінансісты будуць пераконваць беларускі ўрад у неабходнасьці лібэралізацыі коштаўтварэньня, паскарэньня тэмпаў назапашваньня валютных рэзэрваў ды павелічэньня бюджэтнага фінансаваньня сельскае гаспадаркі. Сталы прадстаўнік МВФ ў Літве і Беларусі лічыць, што банкі не павінны крэдытаваць АПК, бо яны рызыкуюць не вярнуць сваіх грошаў, а значыць страціць ліквіднасьць.

Аўтарытэтная фінансавая арганізацыя пагодзіцца на перамовы толькі ў выпадку, калі на працягу 6-ёх месяцаў будуць выконвацца яе асноўныя патрабаваньні: скарачэньне грашова-крэдытнае эмісыі, зьніжэньне тэмпаў інфляцыі, існаваньне адзінага абменнага курсу для *BYB*. Для кіраўнікоў мінэканомікі, мінфіну й Нацбанку чарговым крокам на шляху да паразуменьня з патэнцыйнымі крэдытэрамі стаўся тэлемост з прадстаўнікамі МВФ «Мінск – Вашынгтон», наладжаны пры пасрэдніцтве Сусьветнага банку. Суразмоўцы прааналізавалі выкананьне рэкамэндацый МВФ для пачатку праграмы эканамічнага маніторынгу ў краіне.

СПОРТОБЗОР

Возвращение Каприати

В минувшее воскресенье закончился первый в этом сезоне турнир серии «Большого шлема» – открытый чемпионат Австралии. В отличие от прошлогодних турниров, богатых на сенсационные результаты, этот прошел достаточно спокойно. В мужском одиночном разряде в финал вышли Андрэ Агасси и Арно Клемен. Последний не сумел оказать американцу достойного сопротивления, и Агасси закономерно выиграл 6:4, 6:2, 6:2.

Гораздо более неожиданным оказался женский финал, в котором сошлись Мартина Хингис и Дженнифер Каприати. Швейцарка, возглавляющая мировой рейтинг, уже обыгравшая на этом турнире сестер Вильямс, неожиданно легко уступила 6:4, 6:3. Благодаря этому американская теннисистка вновь попала в первую десятку мирового рейтинга (№ 7), куда она в последний раз входила в 1994 году. Это тем более удивительно, что Дженнифер только недавно вернулась в большой спорт после долгого перерыва.

Парные разряды выиграли: у мужчин – Ю. Беркман – Т. Вудбридж, у женщин – С. Вильямс – В. Вильямс. Микст выиграли Э. Феррейра – К. Морариу. Белорусские спортсмены выступили на турнире неудачно, покинув его ещё на ранних стадиях.

Кто бы сомневался

В эти же выходные завершился проходящий в Москве Кубок Содружества, где выступают сильнейшие клубы СНГ. Все предыдущие годы на фоне остальных команд выделились «Спартак» Москва и «Динамо» Киев, финальный поединок которых обычно являлся кульминацией турнира. Однако в этом году болельщики обмануты в своих ожиданиях. Киевляне выглядели крайне слабо и выбыли из основной части турнира.

Достойной заменой низвергнутым фаворитам оказали футболисты рижского «Сконто». Без всяких проблем латыши добрались до финала, где в упорной борьбе уступили футболистам московского «Спартака» со счетом 1:2, и то лишь в дополнительное время.

Неплохо проявил себя и белорусский чемпион – мозырьская «Славия». Проиграв на турнире только паре финалистов, наша команда, переиграв в последней встрече ашгабадский «Копетдаг» 4:0, заняла в итоге 3-е место в финальной группе.

В целом турнир оставил двойственное впечатление, прежде всего, из-за выступления киевлян. Многие обвинили их в элементарном неуважении к соперникам. Имея не самый слабый подбор игроков, они, по выражению участников турнира, *«не играли, а ходили по полю»*. С другой стороны, остальные команды показали вполне добротный, особенно для зимы, футбол. И то, что наша «Славия» оказалась далеко не последней, нас, конечно, радует.

Русский триумф

В минувший уик-энд завершился чемпионат Европы по фигурному катанию. В данном виде спорта в очередной раз не оказалось конкурентов российским спортсменам. Три золотых, три серебряных и три бронзовых награды – таков итог выступления наших соседей. Особенно впечатляют фигуристки, занявшие весь пьедестал почета.

Представители нашей страны выступили не столь успешно. Юлия Солдатова не сумела закончить соревнования из-за травмы, а Сергей Давыдов оказался только пятым. Но если учесть, что у Беларуси успехи в фигурном катании практически отсутствуют, то и пятое место для нас безусловный успех.

Пока не последние, но...

Отборочный турнир к чемпионату Европы 2001 года по баскетболу сложился для белорусов неудачно. Команда проигрывала всем, кому только можно.

Возможно, именно поэтому руководство федерации баскетбола пошло на смену руководства сборной посреди отборочного цикла. Спасать команду было доверено Александру Борисову. И результаты обнадеживают. Из пяти встреч были выиграны две (единственные победы в этом отборочном цикле), да и в остальных команда выглядела достойно.

В последней встрече турнира оказались повержены австрийцы (71:54), и эта победа дает нам право надеяться, что лучшие дни у нашей команды еще впереди.

Если же проанализировать состав команд, получивших право участвовать в финальном турнире, то поражает количество пробившихся туда представителей советской и югославской баскетбольных школ: из 16 команд 9. Интересно, кто смог бы им противостоять, если бы они вновь собрались в одну команду? В числе команд, которые с 1 по 9 сентября в Стамбуле и Анкаре (Турция) поспорят за звание сильнейшей в Европе, сборные Италии, Испании, Югославии, Франции, Литвы, России, Германии, Турции, Хорватии, Латвии, Греции, Эстонии, Израиля, Боснии и Герцеговины, Словении и Украины.

Балет на льду

В будущие выходные регулярный чемпионат НХЛ возьмет паузу. В этот день пройдет олл-стар гейм, знаменующая собой экватор первенства. Как и в прошлом году, сыграет сборная местных игроков против команды легионеров, а не сборные Востока и Запада, как это делалось ранее.

Разумеется, выяснить вопрос, кто же сильнее, это не поможет, ведь настоящей борьбы в таких играх не бывает. Ожидается просто красивый хоккей. Кроме самой игры пройдут различные соревнования с целью определить, кто всех быстрее, сильнее, точнее и т. д.

Подготовил Сергей ВИТАЛЬЕВ

МУЗЫКА

КАРОЛЬ ПАМЁР. ЖЫВЕ РОК-Н-РОЛ!

Глеб РУБАНАЎ

«Рок-Каранацыя», што прайшла ў апошнюю пятніцу студзеня, стала этапнай для беларускага року. Але не таму, што на ёй упершыню каранавалі тых, хто ўжо меў карону тры гады таму. І не таму, што гэта была першая «Каранацыя» новага стагодзьдзя.

Увечары 26 студзеня раптам стала ясна, што пэрыяд беларускага року, адзначаны сямьмю гадамі каранаваньняў, скончыўся нечакана і бескампрамісна. Усе музыканты, зь кім давялося паразмаўляць пасьля «Каранацыі», былі адзінадушныя – гэта апошняе мерапрыемства.

Добра гэта ці дрэнна? Гэта натуральна, бо кожная ідэя мае вызначаны ёй час жыцьця. «Рок-Каранацыя» на час свайго зьяўленьня стала вельмі прагрэсыўнай падзеяй. Яна аб'ядната рокерскую тусоўку і дала ёй стымул для творчасьці й развіцьця. «Каранацыя» не дала рокерам заглохнуць у сваіх падвалах і на рэпэтыцыйных кропках. Нягледзячы на палітычныя пэртурбацыі й забароны канцэртаў, рокеры ведалі, што, прынамсі, адзін фэст адбудзецца пры любым надвор'і. Практычна ніхто ніколі ўсур'ёз не змагаўся за рок-карону. Проста каранацыя вяртала адчуваньне ейнай запатрабаванасьці, без чаго немагчыма стварэць.

Першая «Каранацыя» 1995 году была сьціплай і выглядала на нефармальную рокерскую тусоўку. Тады ў памяшканьні Альтэрнатыўнага тэатру панавала атмасфэра сьвята і чагосьці нетрывалага, а значыць – цікавага. Наўрад ці хто ўяўляў тады, што праз пару год акцыя дарасьце да маштабу нацыянальнай «Грэмі» і будзе праходзіць у недасягальных тады канцэртных залях. Менавіта тады зарадзілася жартоўная традыцыя – расьпіваць гарэлку непасрэдна з хрустальнай кароны. Гэта сымбалізавала ўмоўнае стаўленьне рокераў да ўрачыстых рэгаліяў.

«Каранацыю» крытыкавалі амаль заўжды. Спачатку – за *«беларускасьць»*, потым – за *«валютарызм»*, за *«папсовасьць»*. Апошнюю каранацыю крытыкавалі ўжо за *«прадказальнасьць»*. Але бацькі-заснавальнікі акцыі Юрый Цыбін і Генадзь Шульман мелі рацыю, калі казалі: *«Не падабаецца – рабіце па-свойму!»*. Зрабіць сваю «Каранацыю» ня здолеў ніхто. Пры ўсіх недахопах мерапрыемства было адзіным. І самае галоўнае – яно было неабходным, бо дазваляла данесьці да публікі тое, што немагчыма было данесьці праз радыё, тэлевізію й невялікія наклады альбомаў.

Лаючы мерапрыемства ўвесь год, рокеры ўсё роўна забывалі старыя крыўды і прыходзілі на яго, бо гэта была сьвятая справа. Журналісты прыходзілі на «Каранацыю», бо мерапрыемства было прэстыжным. І менавіта дзякуючы арганізатарам «Рок-Каранацыі» панятак «беларуская рок-зорка» нарэшце перастаў быць нонсэнсам.

Але менавіта тут і хавалася падводная бомба для самой ідэі «Каранацыі». Яна стварыла слухача беларускім гуртам ды ўмацавала разнастайную беларускую рок-культуру. Але калі слухачы й гурты знайшлі адно аднаго, ім сталі непатрэбныя пасрэднікі. Апошнім цьвіком у труну «Каранацыі» стаў выпуск новага альбому NRM й іхны тур па гарадох Беларусі. Гэта сьцьвердзіла існаваньне масавай рок-культуры, якой больш непатрэбная падпорка ў выглядзе «Рок-Каранацыі». Цяпер слухачам ужо нецікава глядзець, як сотня чалавек дае карону тым, каго народ даўно лічыць сваімі героямі.


«Рок-Каранацыя» зрабіла сваю справу і вычарпала сябе. Яна, безумоўна, была яркай падзеяй і вызначыла этап у развіцьці беларускага року. Але любы этап рана ці позна адыходзіць у гісторыю. І апошняя «Каранацыя» з канцэртам усіх папярэдніх каранаваных асоб, з каранаваньнем гурта стагодзьдзя – «Песьняроў», з узнагародай NRM, што фактычна зацьвярджала народны выбар – на горшае завяршэньне этапу. ■

ВЫСТАВКА

Орудие производства – ножницы

Галина ЖИГУЛЬ

В минском Музее современного изобразительного искусства открылась выставка Вячеслава Дубинки. Он представил на суд зрителей подборку своих произведений за последние 30 лет – так называемые вырезанки.



Сам автор во время демонстрации выставки показывал зрителям, как делаются маленькие шедевры. Трудно представить, что роскошные ажурные узоры, диковинные деревья и цветы, невиданные птицы, ошеломляющие величественные фигуры созданы с помощью одного орудия производства – ножниц.

Обыкновенные портновские ножницы однажды захватил с собой в командировку фотокорреспондент газеты *«Звязда»* Вячеслав Дубинка, решив заняться чем-то интересным и полезным для себя во время долгих дорог. Однажды увлекшись вырезанками, Вячеслав уже не выпускал ножниц из рук. Как он говорит, сначала это были просто банальные снежинки, потом формы усложнились, стали появляться целые композиции. Он пытался воспроизвести очертания старинных замков и дворцов. Что интересно, никаких предварительных зарисовок, проработок Вячеслав не делает. Узор рождается лишь тогда, когда в руках мастера появляются бумага и ножницы.

Когда Вячеслав Дубинка в начале 70-х годов впервые предложил свои произведения на республиканскую выставку народного творчества, это было воспринято неоднозначно. Мол, что это вообще такое – вырезанка? Как вспоминает доктор искусствоведения Евгений Сахута, особенно любопытные зрители на выставке ковыряли произведения пальцем, чтобы убедиться, что эти детализированные композиции вырезаны из обыкновенной бумаги.

Вырезанка из народного быта почти исчезла. Ни одного образца не сохранилось в музейных фондах Беларуси. Хотя достаточно полно представлены они в музеях Литвы, Польши, Украины, где также бытовали. Но там, очевидно, отношение к своей культуре несколько иное, чем в Беларуси.

Вячеслав Дубинка, кстати, хорошо помнил, что простенькие узоры из бумаги делала его мать и украшала ими окна, домашние иконы, новогоднюю елку. Но уже в первое послевоенное десятилетие эти милые деревенские красоты стали выходить из употребления. Поэтому Вячеславу пришлось провести определенную исследовательскую работу, чтобы возродить некогда популярный вид народного творчества. В конце XIX и в первой половине XX столетия ажурные бумажные узоры имелись почти в каждом сельском доме.

В XVIII-XIX веках в среде белорусской шляхты были распространены так называемые силуэты – вырезанные из черной бумаги силуэтные портреты, фигурки людей и даже сложные сюжетные композиции, которыми украшали интерьеры, дамские альбомы, использовали в качестве подарков. Познание истории и искусства вырезания бумажных узоров дало импульс для собственных импровизаций и фантазий Вячеслава Дубинки.

В последние годы искусство вырезанки приобретает все большую популярность. Сегодня, по словам председателя правления Белорусского союза мастеров народного творчества Евгения Сахуты, в этой организации более десяти мастеров вырезанки, и каждый имеет собственный почерк, излюбленную тематику, характерную манеру исполнения. Доступна вырезанка по технологии исполнения и в детском саду, и в школе, бери лишь ножницы, бумагу – и твори на здоровье! ■

ТЕАТР

Здесь любят зрителя

Татьяна ПОЛЯКОВА

Семь лет назад продюсер Владимир Ушаков создал в Минске театральное агентство «Виртуозы сцены».



Вскоре агентство превратилось в антрепризу, иными словами, стало не только прокатывать гастрольные спектакли, но и выпускать свои. *«Самое трудное было – решиться»*, – говорит Владимир Ушаков. – *А коль решение принято, остальные проблемы преодолевались.*

Мы хотели ставить современные смешные пьесы, чтобы люди приходили и отдыхали. Чтобы наслаждались виртуозной работой артистов, потому что «Виртуозы» – это в первую очередь актерский театр.

Но в любом спектакле мы стараемся и задеть человека, чтоб он ушел задумавшись, а увиденное на сцене осталось в голове и в душе. Из всех спектаклей, что родились у нас в антрепризе, пока ни один не снят. Пусть они идут раз в месяц, но собирают почти полные залы».

По договоренности с театром Табакова «Виртуозы» взяли для первой постановки итальянскую пьесу «Сублимация любви», зрелищную, с хорошими комедийными ситуациями. «Сублимация» только-только начала идти в Москве в театре Олега Павловича. «Виртуозы» поставили ее вторыми на территории бывшего СССР. Спектакль идет уже четвертый год и неизменно пользуется успехом.

Второй была веселая итальянская пьеса «Дурацкая любовь». Оба спектакля поставил приехавший из России Евгений Волобоев, приверженец театра Брехта, чье творческое видение совпало со взглядами Ушакова.

Затем «Виртуозы» замахнулись на некое подобие мюзикла. Появилась театральная фантазия «Это ты – Моцарт». Судьба спектакля оказалась трудной. В нем было занято очень много артистов – молодых и именитых, многие из которых, нахлебавшись белорусской нищеты, разъехались по ближнему зарубежью. Но Владимир Ушаков все же надеется когда-нибудь всех собрать и восстановить спектакль.

В коллектив антрепризы влилась группа из купаловского театра во главе с режиссером Ниной Пискаревой. Появился спектакль по французской пьесе «Ужасные родители», психологическая драма, в которой играют Александр Лабуш, Елена Сидорова, Елена Иванникова и др.

Как полагает Владимир Ушаков, в театре непременно должна быть сценическая классика. Ибо пьесы, которые пережили столетия и остались нужны, интересны людям, – основа основ восприятия искусства. Первым классическим спектаклем стала «Бедная Лиза» – мелодрама известного российского историографа и модного писателя 19 века Николая Карамзина в постановке Николая Пинигина. По мнению Ушакова, Николай Пинигин больше и лучше воплощает себя в классической драматургии.

Потом были «Голоса» Варфоломеева с Владимиром Гостюхиным и стремительно приобретающей популярность после их совместного спектакля «Миленький ты мой» Аллой Пролич в главных ролях.

«Эта постановка – идея Гостюхина. Я доверился его вкусу», – говорит Владимир Ушаков. – *И хочу сказать, такого Гостюхина мы не видели никогда: ни в кино, ни в театре. Мы привыкли, что этот артист играет сильных мужиков, а здесь у него роль тихого и застенчивого человека. И я понимаю, как артист он хочет сломать стереотип собственного восприятия. Значит, внутренне готов к интересным поворотам».*

У театра много сценических планов. И дай Бог ему долгой жизни. Ведь сегодня в Минске остались в живых только два частных театра: «Христофор» и «Виртуозы сцены». Остальные пали, задушенные экономической удавкой. ■

ПОНЕДЕЛЬНИК, 5 ФЕВРАЛЯ

15.00, 8.00, 23.35 Новости.
15.15 Фильм - детям. «Иванка и царь Поганин». Худ. фильм.
16.35 Теленавигатор.
17.00 «Все мои дети». Сериал.
18.15 Политические диалоги.
18.45 Зона Икс.
19.00 Ж.Рено в приключенческой комедии «Ягуар» (Франция).
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.30 Права человека: взгляд в мир.
21.50 «Река надежды». Сериал.
22.40 Стадион.
23.05 Планета «АРТ».
23.50 «СТВ-24 часа».

14.00, 17.00, 23.25 Новости.
14.20 Звездный час.
14.45 ...До шестнадцати и старше.
15.20 Мультсериал «Все псы попадают в рай».
15.45 Веселые истории в журнале «Ералаш».
15.55 «Воздушные замки». Сериал.
17.25 «Поводырь». Спецрепортаж.
17.45 Жди меня.
18.40 Олег Табаков и Алексей Булдаков в сериале «Что сказал покойник».
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время. Информационный канал.
21.00 Сериал «Секретные материалы» («X-files»).
22.40 Взгляд.
23.40 Сериал «Человек ниоткуда».

16.00, 19.00, 22.00 Вести.
16.30 Вечерний экран. Валерий Гаркалин, Алена Хмельницкая, Марина Могилевская и Игорь Бочкин в телесериале «Директория смерти».
18.00 Ирина Муравьева, Александр Михайлов, Елена Коренева и Ивар Калныньш в телесериале «С новым счастьем!».
19.30 Подробности.
19.50 Авторская программа Елены Масюк. «Этапом на Запад».
20.20 «Аншлаг» и Ко.
21.30 Михаил Жванецкий. «Простые вещи».
22.30 После «Вестей».
22.40 «Репортер» с Михаилом Дегтярем. «Куклы».
22.55 Спорт за неделю.
23.50 Дежурная часть.
0.00 Прогноз погоды.

16.00 «Улица моего детства». Художник Эдуард Кочергин.
16.15 «Вижу цель!» Тележурнал.
16.40 «Эмили». Сериал.
